**Садовіч, А.** У ваколіцах Кабула / А. Садовіч // Веснік Глыбоччыны. — 2009. — 4 лют. — С. 2.

**У ВАКОЛІЦАХ КАБУЛА**

З Віктарам Станіслававічам Бервячонкам сядзім у ягонай хаце ў вёсцы Карабы-2, разглядаем здымкі, якія ён прывёз з Афгана («Дома іх не многа, большасць – у Карабоўскай СШ»), вядзём спакойную гутарку.

– Дзякуючы Лёшку *(мой субяседнік перадае мне чарговы фотаздымак)*, змог узяць сябе ў рукі ў першым баі пад Кабулам, – згадвае Віктар Станіслававіч. – Мы ж трапілі туды ў ліку першых, бачылі, як дагараў Дом Урада. Не паспелі вырыць у поўны рост акопы, як з боку Кабула на нас пайшлі душманы. І столькі іх было, што аж у вачах пацямнела. А ў мяне на аўтамат – толькі тры ражкі патронаў: не паспелі яшчэ падвезці. І загад: падпускаць як мага бліжэй. Ну, зусім, як у даўнім фільме «Чапаеў». Трымаю аўтамат і адчуваю: рукі дрыжаць. І – думка: «А як жа я ражкі буду перазаражаць?» І тут Лешка падае мне цыгарэту: маўляў, пакуры, супакойся. І я першы раз у жыцці закурыў...

Не лёгка даюцца сёння ўспаміны Віктару Станіслававічу. Той першы бой для яго і для многіх ягоных равеснікаў мог стаць і апошнім. Добра, што своечасова на дапамогу падаспелі танкісты, таму атаку адбілі, выстаялі.

Хвіліну-другую памаўчалі: кожны думаў аб нечым сваім. А ўзнавілася размова дзякуючы гаспадыні Людміле Уладзіміраўне, якая, управіўшыся па гаспадарцы, прысела каля мужа:

– Віктар не аднойчы выступаў перад школьнікамі, і я заўважыла, што ён вельмі хвалюецца, відаць, вяртанне ў далёкія 80-ыя прыносіць яму душэўны боль. Баліць ягонае мінулае і мне. Таму, калі па тэлеканале паказваюць фільмы пра Афганістан, мы выключаем тэлевізар.

Служыў В. Бервячонак у войсках сувязі, якія, акрамя вырашэння лакальных задач, забяспечвалі пастаянную сувязь з Масквой, з Віцебскай дэсантнай дывізіяй.

– З першых дзён знаходжання ў Афганістане нас вучылі быць асцярожнымі, – гаворыць Віктар Станіслававіч. – І мы вучыліся быць такімі. Рызыку толькі тады можна вітаць, калі яна апраўданая.

За час ягонага прабывання ў Афганістане смерць двойчы глядзела Віктару ў вочы: на самым пачатку, пад Кабулам, і напрыканцы, калі ўжо быў падпісаны загад аб адпраўцы яго на Радзіму, калі ён быў ужо не вайскоўцам,

... Мірныя думкі-сны парушыў усхваляваны голас камбата: «Хлопцы, памажыце, прарвалася банда з Пакістана, колькасцю да двух тысяч чалавек...».

У бой з бандытамі ўступілі ўсе...

На шчасце, ужо многа гадоў В. С. Бервячонак жыве мірным жыццём. Яго цэняць і паважаюць у калектыве Карабоўскай СШ, дзе ён займае пасаду намесніка дырэктара па гаспадарчай частцы. Тут жа, у школе, працуюць жонка Людміла Уладзіміраўна і старэйшая дачка Кацярына. Малодшая, Насця, яшчэ школьніца. А ўспаміны? Яны прыходзяць да Віктара Станіслававіча ўсё радзей і радзей, а вось фотаздымкам, зробленым у гарах Афганістана, з якіх ён пазірае на нас строгім выпрабавальным позіркам: «А ты змог бы?», наканавана калі не вечнае, то доўгае-доўгае жыццё.

**А. Садовіч**